ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

Репозиторий БГПУ

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

5. Миленький А.Я. Формирование у подростка интереса к учению. Минск, 1969.
6. Олту Л.Ф. Развитие интереса старшеклассников к истории на основе совершенствования учебного процесса: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02. / Моск. гос. пед. ин-т. М., 1991.
7. Формирование познавательных интересов школьников / отв. ред. Г.И. Щукина. Л., 1968.
8. Бондаревский В.Б. Воспитание интереса к знаниям и потребности к самообразованию: кн. для учителя. М., 1985.
9. Практическая психология образования: учеб. для студ. высш. и средн. спец. учебных заведений / А.Д. Андреева [и др.]; под ред. И.В. Дубровиной. М., 2000.
10. Мухина В.С. Возрастная психология: феноменология развития: учеб. для студ., обучающихся по пед. специальностям. 10-е изд., перераб. и доп. М., 2006.
11. Лихачёв Б.Т. Педагогика: курс лекций: учеб. пособие для студ. пед. учебн. заведений и слушателей ИПК и ФПК. М., 1998.
12. Островский О.Б. О формировании интереса учащихся к истории // Преподавание истории и обществознания в школе. 2001. № 10.
13. Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. Мінск, 1993.
14. Біч М.В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. шк. / пад рэд. Я.М. Бабосава. Мінск, 1998.
15. Мілаванаў В.А. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1917 г.: вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання. 2-е выд. Мінск, 2000.
16. Сосна У.А., С.В. Марозава, С.В. Паноў. Гісторыя Беларусі (XIX ст. – 1917 г.): вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / пад рэд. М.С. Сташкевіча. Мінск, 2005.
17. Кніга для чытання па гісторыі Беларусі (канец XVIII – 1927 г.): 8-ы клас: дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з бел. і рус. мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / аўт.-склад. Н.Я. Новік. Мінск, 2007.
18. Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах: дакастрычніцкі перыяд / склад. М.Р. Гнеўка. Мінск, 1979.
19. Баргдановіч І. Метадычныя шляхі фарміравання ў школьнікаў гістарычнай эмпатыі // Гісторыя: праблемы выкладання. 2007. № 4.
20. Падрабязней пра гэту тэхналогію глядзіце ў выданнях: Загашев В.А., Заир-Бек С.И. Критическое мышление: технология развития. СПб., 2003; Заир-Бек С.И., Муштавинская И.В. Развитие критического мышления на уроке: пособие для учителя. М., 2004.
21. Козленко С.И., Саплина Е.В. Профильное обучение и современные образовательные технологии: курс лекций для дистанц. обучения. Лекция 5. Современные образовательные технологии на уроках истории в профильной школе // История. 2007. № 21.



Глава

# 2 АРГАНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

Пры арганізацыі працэу навучання гісторыі Беларусі ў IX класе настаўніку неабходна імкнуцца да выкарыстання разнастайных арганізацыйных форм, актыўных метадаў і прыёмаў навучання, якія характарызуюцца:

- актывізацыяй мыслення школьнікаў;
- забеспячэннем пастаяннага непасрэднага ўдзелу вучняў у адукацыйным працэсе;
- самастойнай выпрацоўкай рашэнняў, павышанай ступенню матывацыі і эмацыянальнасці;
- пастаянным узаемадзеяннем і арганізацыяй сумеснай рэфлексіўнай дзейнасці настаўніка і вучняў у ходзе адукацыйнага працэсу.

Да ліку такіх прыёмаў навучання гісторыі Беларусі можна аднесці праблемнае выкладанне вучэбнага матэрыялу, устанаўленне і рэалізацыю міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязей, вобразна-эмацыянальнае выкладанне гістарычнага матэрыялу. Коратка ахарактарызуем кожны з іх.

**Праблемнае выкладанне вучэбнага матэрыялу** ў істотнай ступені адпавядае прыведзеным вышэй характарыстыкам і таму можа спрыяць павышэнню эфектыўнасці школьнай гістарычнай адукацыі. Што ж такое праблемнае выкладанне? На думку вядомага савецкага гісторыка-метадыста Н.Г. Дайры, выкладанне з'яўляецца праблемным, калі яно «ўсім сваім зместам і спосабам раскрыцця ставіць якое-небудзь пытанне, што патрабуе вырашэння, але прамога вырашэння не дае і вымушае вучняў шукаць адказ. У гэтым выпадку і ўзнікае праблемная сітуацыя» [1, с. 93].

Праблемная сітуацыя – гэта сітуацыя, у якой вучні выяўляюць асабіста-значныя праблемы, выкліканыя непаўнатой ведаў, супярэчлівасцю інфармацыі, парадаксальнасцю з'яў і г. д. У яе аснове ляжыць псіхалагічны стан цяжкасці, немагчымасць растлумачыць факт або выканаць заданне з апорай на веды, якія маюцца ў вучня. На ўроках гісторыі Беларусі можна выкарыстоўваць разнастайныя



Репозиторий БГПУ